# СТАТУТ

## АСАЦЫЯЦЫІ БЕЛАРУСКАГА БІЗНЕСУ ЗА МЯЖОЙ
## (назва па-ангельску: Association of Belarusian Business Abroad – і афіцыйная абрэвіятура для абодвух "ABBA")
## СУЦЭЛЬНЫ ТЭКСТ
## (ад 15 снежня 2021 г.)

### 1. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

§ 1.

1. Аб'яднанне пад назвай Асацыяцыя беларускага бізнесу за мяжой АББА, далей – Асацыяцыя, з'яўляецца добраахвотнай, незалежнай, самакіравальнай і ўстойлівай арганізацыяй, якая аб'ядноўвае прадпрымальнікаў і арганізацыі, якія аб'ядноўваюць прадпрымальнікаў.
2. Асацыяцыя дзейнічае згодна з палажэннямі Закона аб арганізацыях працадаўцаў (Dz. U. №55 ад 1991 года паз. 235 з наступнымі зменамі).

§ 2.

1. Сядзіба Асацыяцыі і яе кіраўніцтва знаходзяцца ў Варшаве.
2. Асацыяцыя з'яўляецца юрыдычнай асобай.

§ 3.

1. Асацыяцыя дзейнічае на тэрыторыі Рэспублікі Польшча.
2. Аб'яднанне можа дзейнічаць таксама па-за межамі Рэспублікі Польшча, у тым ліку ў іншых краінах Еўропы, у Беларусі і Украіне.

§ 4.

Асацыяцыя можа далучацца да і быць сябрам нацыянальных і міжнародных арганізацый працадаўцаў з падобнаю мэтаю і характарам.

§ 5.

Тэрмін працы Асацыяцыя неабмежаваны.

## 2. МЭТЫ І ЗАДАЧЫ АСАЦЫЯЦЫІ

§ 6.

1. Мэтай і задачай Асацыяцыі з'яўляецца: прадстаўленне інтарэсаў аб'яднаных Сябраў перад органамі ўлады і дзяржаўнага кіравання, а таксама органамі мясцовага самакіравання, прыватнымі асобамі ў краіне і за яе межамі, нацыянальнымі і міжнароднымі арганізацыямі, органамі Еўрапейскага Звязу; а таксама абарона іх правоў і эканамічных свабодаў.

2. Асацыяцыя рэалізуе свае мэты і задачы шляхам:

1) падрыхтоўкі стратэгіі дзейнасці Асацыяцыі,

2) правядзення кансультацый адносна пытанняў ужывання нормаў гаспадарчага права, працоўнага права і сацыяльнай абароне або праектаў прававых актаў,

3) прадстаўлення ўладам і органам дзяржаўнага кіравання або палітычным ці грамадскім арганізацыям меркавання і пазіцыі Асацыяцыі па пытаннях, якія тычацца гаспадарчай дзейнасці прадпрымальнікаў, а таксама распаўсюду інфармацыі аб дзейнасці прадпрымальнікаў з беларускімі каранямі (у тым ліку партнёраў, прадстаўнікоў, эканамічных уладальнікаў прадпрыемстваў) у Польшчы і за мяжой,

4) арганізацыя сустрэч, канферэнцый, трэнінгаў або чытанняў, накіраваных на актывізацыю, развіццё і навучанне прадпрымальнікаў,

5) арганізацыя супрацы і ўзаемадапамогі Сябраў Асацыяцыі,

6) супраца з іншымі арганізацыямі, мэты якіх супадаюць з мэтамі Асацыяцыі,

7) арганізацыйна-эканамічнае кансультаванне Сябраў Асацыяцыі,

8) правядзенне падзеяў, накіраваных на інтэграцыю Сябраў Асацыяцыі,

9) правядзенне грантавых праграм і аказанне фінансавай падтрымкі,

10) аналітычнай, навуковай і даследчай дзейнасці адносна эканамічных і палітычных, культурных, эканамічных і сацыяльных працэсаў, якія адбываюцца ў Беларусі ў іншых краінах,

11) верыфікацыя бізнесу з беларускімі каранямі з мэтай праверкі дзейнасці суб'екту гаспадарання і звязаных з ім арганізацый з пункту гледжання, сярод іншага, сувязі з рэжымам Лукашэнкі.

§ 7.

1. Асацыяцыя рэалізуе свае статутныя мэты таксама шляхам ажыццяўлення гаспадарчай дзейнасці самастойна або шляхам стварэння суб'ектаў гаспадарання і сумеснай дзейнасці з іншымі суб'ектамі на аснове грамадзянска-прававых дамоваў.

2. Прадпрымальніцкая дзейнасць можа ўключаць:

1) правядзенне трэнінгаў,

2) запуск інтэрнэт-старонак,

3) вядзенне кансультатыўнай дзейнасці,

4) набыццё акцый або доляў у гаспадарчых таварыствах, далучэнне да юрыдычных або арганізацый, якія вядуць прадпрымальніцкую дзейнасць,

5) вядзенне клубнай і рэстараннай дзейнасці,

6) вядзенне кнігарні,

7) аказанне навукова-даследчых паслуг,

8) капітальныя ўкладанні,

9) вытворчасць фільмаў, запісаў тэлепраграм, гуказапісаў
і запісу музычных твораў, у тым ліку для рэкламы і прасоўвання,

10) дзейнасць у сферы рэкламы, у прыватнасці стварэнне сцэнарыяў для рэкламы і рэкламных ролікаў, а таксама іншая маркетынгавая дзейнасць і маркетынгавае кансультаванне,

11) ажыццяўленне дзейнасці ў сферы інфармацыі, у тым ліку падрыхтоўка дакладаў, заяваў або іншых відаў публікацый,

12) вядзенне выдавецкай дзейнасці,

13) атрыманне вонкавага фінансавання, набыццё, кіраванне і правядзенне праектаў у рамках еўрапейскіх фондаў і іншых крыніц фінансавання,

14) правядзенне даследаванняў у галіне рынку і грамадскай думкі, збор звестак аб дзейнасці суб'ектаў гаспадарання і звязаных з імі асобаў разам з аналізам сабраных звестак.

3. Даходы ад прадпрымальніцкай дзейнасці поўнасцю накіроўваюцца на рэалізацыю статутных мэтаў Асацыяцыі і на пакрыццё выдаткаў, звязаных з дзейнасцю Асацыяцыі.

## 3. СЯБРОЎСТВА Ў АСАЦЫЯЦЫІ – ПРАВЫ І АБАВЯЗКІ

### § 8.

1. Сяброўства ў Асацыяцыі з'яўляецца асабістым (Сябра) або карпаратыўным (Карпаратыўны сябра).

2. Сябрам Асацыяцыі можа быць любы прадпрымальнік, саюз, фонд, асацыяцыя або федэрацыя працадаўцаў або прадпрымальнікаў або іншая юрыдычная асоба, якая дзейнічае на тэрыторыі Рэспублікі Польшча, у Еўропе (за выключэннем Расейскай Федэрацыі і Рэспублікі Беларусь) або Паўночнай Амерыкі.

3. Прыём у Сябры Асацыяцыі адбываецца на падставе пастановы Праўлення, пасля папярэдняга выяўлення зацікаўленай асобай волі далучэння ў Асацыяцыю, правядзення

працэдуры прыёму, вызначанай пастановай Праўлення, і аплаты ўнёску ў памеры, які дзейнічае на момант выяўлення волі далучэння да Асацыяцыі.
4. Сябры, якія не з'яўляюцца фізічнымі асобамі, прадстаўляюцца ў Асацыяцыі іх даверанымі прадстаўнікамі.

§ 9.

1. Карпаратыўным сябрам можа стаць суб'ект права, які не адпавядае ўмовам, пра якія гутарка ў у § 8 ч. 2 і 3 вышэй. Гэтае сяброўства атрымліваецца шляхам падачы суб'ектам пісьмовага выяўлення волі, у якой ён вызначае спосаб падтрымкі дзейнасці Асацыяцыі. Прыём у Карпаратыўныя сябры прадугледжвае правядзення працэдуры прыёму ў Карпаратыўныя сябры, вызначанай пастановай Праўлення. Заява павінна быць падпісана асобамі, упаўнаважанымі прадстаўляць кандыдата. Прыняцце кандыдатуры адбываецца пастановай Праўлення Асацыяцыі.
2. Карпаратыўны сябра можа падаць заяву аб выхадзе з Асацыяцыі. Праўленне Асацыяцыі можа прыняць пастанову аб выключэнні Карпаратыўнага сябра ў выпадку яго дзейнасці, якая не адпавядае Статуту Асацыяцыі або наносіць шкоду Асацыяцыі, а таксама парушае Кодэкс бізнес-этыкі ABBA або іншы ўнутраны акт, які рэгулюе правы або абавязкі Карпаратыўных сябраў.
3. Карпаратыўныя сябры маюць тыя ж правы, што і Сябры Асацыяцыі, аднак не маюць актыўнага і пасіўнага выбарчага права і не ўдзельнічаюць і не маюць права голасу ў Агульным сходзе сябраў.

§ 10.

1. Сябры Асацыяцыі (Сябра і Карпаратыўны сябра) маюць роўныя правы і абавязкі, калі іншае не прадугледжана Статутам або іншым унутраным актам.
2. Сябры Асацыяцыі абавязаныя:

1) клапаціцца пра добрае імя Асацыяцыі,

2) спрыяць росту ролі і значэння Асацыяцыі,

3) датрымлівацца Статуту і пастановаў органаў Асацыяцыі, датрымлівацца Кодэксу бізнес-этыкі ABBA або іншых унутраных актаў прынятых Праўленнем,

4) ухваляць і актыўна падтрымліваць мэты Асацыяцыі,

5) рэгулярна плаціць сяброўскія ўнёскі,

6) імкнуцца да паляпшэння іміджу прадпрымальніка і прадпрымальніцтва ў грамадскай думцы,

7) паважаць прынцыпы ўзаемадапамогі і нормы прафсаюзнай салідарнасці і ўзаемнай павагі.

3. Асацыяцыя не мае права парушаць незалежнасць Сябраў і ўмешвацца ў іх унутраныя справы.

§ 11.

1. Сябра Асацыяцыі мае права:

1) прымаць актыўны ўдзел у жыцці Асацыяцыі, а галоўным чынам у яе працы і пасяджэннях Агульнага сходу сябраў,

2) уносіць прапановы адносна дзейнасці Асацыяцыі і быць інфармаваным аб рашэннях Асацыяцыі,

3) атрымаць дакументы аб сяброўстве ў Асацыяцыі і ўсе эмблемы Асацыяцыі,

4) падаваць заявы ў кампетэнтныя органы Асацыяцыі адносна ўсіх пытанняў, якія тычацца мэтаў і функцый Асацыяцыі,

5) карыстацца ў сваёй дзейнасці апекай і дапамогай Асацыяцыі, у межах магчымасцяў Асацыяцыі,

6) карыстацца падтрымкай Асацыяцыі ў рэалізацыі сваіх правоў на ўмовах, акрэсленых Праўленнем, у межах магчымасцяў Асацыяцыі,

7) выкарыстоўваць таварны знак Асацыяцыі са згоды і на ўмовах, акрэсленых Праўленнем,

8) галасаваць на Агульным сходзе сябраў і пазачарговых сходах, з улікам § 9 ч. 3.

2. Сябра Асацыяцыі мае пасіўнае і актыўнае выбарчае права ў органы Асацыяцыі .

§ 12.

1. Выключэнне са спісу Сябраў Аб'яднання адбываецца ў выніку:

1) смерці або страты грамадзянскіх правоў у выніку ўступлення ў законную сілу рашэння суда (адносіцца да фізічнай асобы),

2) выключэння з адпаведнага рэестра (адносіцца да юрыдычнай асобы),

3) аб'яўленне банкруцтва або пачатку ліквідацыі (юрыдычнай асобы),

4) атрымання Праўленнем пісьмовай заявы аб выхадзе,

5) неаплаты Сябрам сяброўскага ўнёску,

6) выключэння ў сувязі з:

a) ажыццяўленнем дзейнасці, якая супярэчыць Статуту і пастановам органаў Асацыяцыі, парушэннем Кодэксу бізнес-этыкі АВВА або іншых унутраных актаў, прынятых адпаведнымі органамі Асацыяцыі.

b) ухіленнем ад удзелу ў працы Асацыяцыі,

c) дзейнасцю, якая негатыўна ўплывае на імідж Асацыяцыі.

d) вынясенне Калегіяльным судом рашэння аб выключэнні з Асацыяцыі, калі рашэнне не было абскарджанае або калі апеляцыя не была задаволеная.

2. Праўленне сваёй пастановай вызначае спіс Сябраў Асацыяцыі, у адносінах да якіх адбылося выключэнне.

§ 13.

1. Сябра асацыяцыі, саюзу або федэрацыі працадаўцаў або прадпрымальнікаў, якія дзейнічаюць на тэрыторыі Рэспублікі Польшча, які з'яўляецца Сябрам Асацыяцыі, з моманту яго далучэння да Асацыяцыі да выхаду з яго набывае статус Федэратыўнага сябра. Калі Федэратыўны сябра адначасова з'яўляецца звычайным Сябрам Асацыяцыі або Карпаратыўным сябрам, да яго ўжываюцца палажэнні Статута, якія датычацца адпаведна Звычайнага сябра Асацыяцыі або Карпаратыўнага сябра.

2. § 8 – 13 не ўжываюцца да Карпаратыўных сябраў, за выключэннем ч. 1, другі сказ.

3. Федэратыўны сябра Асацыяцыі мае права на:

1) доступ да інтэрнэт-старонак Асацыяцыі,
2) доступ да даследаванняў, падрыхтаваных Асацыяцыяй (напрыклад, заканадаўчых, аналітычных),
3) выкарыстанне таварнага знаку Асацыяцыі са згоды і на ўмовах, асобна вызначаных Праўленнем,
4) удзел у некаторых праектах, арганізаваных Асацыяцыяй.

## 4. ОРГАНЫ АСАЦЫЯЦЫІ

§ 14.

1. Органамі Асацыяцыі з'яўляюцца:

1) Агульны сход сябраў,
2) Праўленне,
3) Наглядальная рада.

2. Калі ў Асацыяцыі больш за 50 Сябраў, Агульны сход сябраў можа быць заменены пастановаю Праўлення на Агульны сход дэлегатаў. Парадак і правілы абрання дэлегатаў, а таксама іншых органаў Асацыяцыі вызначаюцца рэгламентам, які прымаецца Праўленнем.

§ 15.

1. Агульны сход сябраў (дэлегатаў) з'яўляецца вышэйшым органам аб'яднання.

2. Да паўнамоцтваў Агульнага сходу адносяцца ў прыватнасці:

1) абранне і адкліканне чальцоў Наглядальнай рады, вызначэнне правілаў аплаты іх працы, зацверджанне фінансавых справаздачаў.

2) прыняцце рэгламенту правядзення Агульнага сходу,

3) разгляд і зацвярджэнне справаздач Праўлення,

4) прызначэнне і адкліканне чальцоў Калегіяльнага суда,

5) унясенне на разгляд Праўлення прапаноў аб унясенні зменаў у дадзены Статут,

6) роспуск Асацыяцыі,

7) разгляд скаргаў на рашэнні Калегіяльнага суда,

8) унясенне ў Наглядальную раду хадайніцтва аб адкліканні Праўлення Асацыяцыі.

3. У Агульным сходзе сяброў (дэлегатаў) удзельнічаюць Сябры Асацыяцыі.

4. У Агульным сходзе сяброў (дэлегатаў) могуць удзельнічаць госці, запрошаныя Праўленнем.

§ 16.

1. Агульны сход сяброў (дэлегатаў) склікаецца Праўленнем Асацыяцыі не радзей за адзін раз у 3 гады.

2. Пры скліканні Агульнага сходу сяброў Праўленне паведамляе ўсім Сябрам аб даце, месцы і прапанаваным парадку дня не менш чым за 7 дзён да даты яго пачатку. Паведамленне накіроўваецца ў выглядзе заказнога ліста, факса або паведамлення, адпраўленага па электроннай пошце (e-mail).

3. Агульны сход сяброў (дэлегатаў) можа, з улікам ч. 5, быць праведзены незалежна ад колькасці ўдзельнікаў, а каб галасаванне было сапраўдным, патрабуецца простая большасць галасоў прысутных Сяброў, якія маюць права голасу.

4. Адносна пытанняў адклікання чальцоў Калегіяльнага суда рашэнні прымаюцца кваліфікаванай большасцю ў 2/3 галасоў прысутных на Агульным сходзе сяброў (дэлегатаў) і патрабуюць прысутнасці не менш чым 50% фактычнага складу Сяброў (Дэлегатаў), а ў выпадку адсутнасці кворуму Праўленне прызначае паўторны сход, які з'яўляецца правамоцным незалежна ад колькасці прысутных сяброў.

5. Адносна пытанняў прызначэння, звальнення або прыпынення паўнамоцтваў чальцоў Наглядальнай рады і роспуску Асацыяцыі рашэнні прымаюцца кваліфікаванай большасцю ў 2/3 галасоў пры прысутнасці не менш як 2/3 Сяброў Асацыяцыі, а ў выпадку адсутнасці кворуму Праўленне прызначае паўторны сход, які з'яўляецца правамоцным незалежна ад колькасці прысутных сяброў.

6. Рашэнні Агульнага сходу прымаюцца толькі па пытаннях, уключаных у парадак дня.

§ 17.

1. Пазачарговы сход можа быць скліканы Праўленнем Асацыяцыі:

1) па ініцыятыве Праўлення,

2) па патрабаванні Наглядальнай рады,

3) па пісьмовай заяве не менш як 30% Сябраў Асацыяцыі.

2. Асобы, якія патрабуюць склікання Пазачарговага сходу, павінны акрэсліць пытанні, якія будуць абмяркоўвацца, § 16 ч. 2 ужываецца адпаведна.

3. Пазачарговы сход павінен быць праведзены не пазней чым на працягу 60 дзён з дня атрымання Праўленнем патрабавання аб яго скліканні, § 16 ч. 6 ужываецца адпаведна.

§ 18.

1. Праўленне кіруе бягучай працай Асацыяцыі.

2. Праўленне можа ствараць Офіс Праўлення.

3. Да кампетэнцыі Праўлення адносяцца таксама:

1) далучэнне новых Сябраў і Карпаратыўных сябраў, а таксама вызначэнне працэдуры далучэння Сябраў і Карпаратыўных сябраў, вызначэнне правілаў, якія ўжываюцца ў дачыненні да Сябраў і Карпаратыўных сябраў (у прыватнасці, прыняцце Кодэксу бізнес-этыкі АВВА або іншых унутраных актаў), якія датычаць, сярод іншага, правоў і абавязкаў Сябраў і Карпаратыўных сябраў, а таксама вызначэнне наступстваў парушэння правоў і абавязкаў (у тым ліку выключэнне з Асацыяцыі),

2) скліканне Агульнага сходу,

3) вызначэнне памеру і спагнанне сяброўскіх унёскаў,

4) прыняцце і выкананне планаў дзейнасці Асацыяцыі і вызначэнне напрамкаў распараджэння маёмасцю і фінансамі, а таксама бюджэту Асацыяцыі, унясенне зменаў у бюджэт, калі гэта вынікае з патрэбаў Асацыяцыі.

5) прызначэнне праблемных камісіяў, вызначэнне прынцыпаў і сферы іх дзейнасці,

5а) прызначэнне і роспуск кансультатыўных і дарадчых органаў Праўлення,

6) кантроль за дзейнасцю Офісу Праўлення,

7) прыняцце рашэнняў аб стварэнні фондаў Асацыяцыі ў межах прынятага бюджэту і зацвярджэнне іх рэгламенту,

8) прыняцце рашэнняў аб куплі-продажы асноўных сродкаў,

9) прыняцце рашэнняў аб куплі-продажы нерухомай маёмасці, якая належыць Асацыяцыі, пасля атрымання станоўчага рашэння Наглядальнай рады,

10) прыняцце палажэнняў аб ільготных правілах выкарыстання Сябрамі формаў дзейнасці Асацыяцыі,

11) вызначэнне правілаў выкарыстання Сябрамі таварнага знака Асацыяцыі,

12) прыняцце пастановаў, ажыццяўленне іншай дзейнасці і прадстаўленне Асацыяцыі ў пытаннях, не аднесеных да кампетэнцыі Агульнага сходу сябраў і Наглядальнай рады,

13) прыняцце зменаў у дадзены Статут са згоды Наглядальнай рады.

§ 19.

1. Праўленне складаецца з 1 да 5 чальцоў. Наглядальная рада можа прызначаць чальцоў Праўлення для выканання функцый Старшыні Праўлення, Віцэ-прэзідэнта або Віцэ-прэзідэнтаў Праўлення. Наглядальная рада таксама можа ўзнагародзіць чальца Праўлення за заслугі перад Асацыяцыяй, уклад у развіццё Асацыяцыі або развіццё беларускага бізнесу, прызначыўшы яго Ганаровым чальцом рашэннем 2/3 галасоў у прысутнасці не менш як 2/3 складу Наглядальнай рады (кворум).

2. Чальцы Праўлення прызначаюцца на пасаду і адклікаюцца Наглядальнай радай простай большасцю галасоў (за выключэннем адклікання чальца Праўлення, які мае статус Ганаровага чальца). Для адклікання чальца Праўлення са статусам Ганаровага чальца патрабуецца прысутнасць 4/5 чальцоў Наглядальнай рады і 9/10 галасоў "за".

3. Тэрмін паўнамоцтваў Праўлення складае 6 гадоў.

4. У выпадку надзвычайных абставінаў Наглядальная рада можа адклікаць Праўленне аднагалосным рашэннем.

5. Прынцыпы і парадак дзейнасці Праўлення вызначаюцца Рэгламентам Праўлення, які зацвярджаецца Старшынём Праўлення. Старшыня Праўлення можа вызначаць размеркаванне задач па бягучых пытаннях Асацыяцыі паміж чальцамі Праўлення.

6. Праўленне прымае рашэнні простай большасцю галасоў, пры роўнай колькасці галасоў вырашальным з'яўляецца голас Старшыні Праўлення.

7. Чальцы Праўлення могуць удзельнічаць у пасяджэннях Праўлення з дапамогай сродкаў дыстанцыйнай сувязі, якія забяспечваюць узаемную чутнасць для ўсіх асобаў, якія ўдзельнічаюць у пасяджэнні. Такі ўдзел з'яўляецца асабістай прысутнасцю на пасяджэнні. Пратакол пасяджэння Праўлення ў такім рэжыме афармляецца ў пісьмовай форме і падпісваецца Старшынём Праўлення, а ў выпадку яго адсутнасці – Віцэ-прэзідэнтам Праўлення.

8. Чальцы Праўлення могуць прымаць рашэнні шляхам перапіскі па пошце або кур'ерам, факсам або электроннай поштай, калі ніводны чалец Праўлення не пярэчыць такой форме прыняцця рашэння. Пратакол аб прыняцці рашэння ў такім рэжыме складаецца ў пісьмовай форме і падпісваецца Старшынём Праўлення, а ў выпадку яго адсутнасці – Віцэ-прэзідэнтам Праўлення.

§ 20.

1. Старшыня або Віцэ-прэзідэнт Праўлення аднаасобна або чалец Праўлення, які дзейнічае сумесна са Старшынём або Віцэ-прэзідэнтам Праўлення, упаўнаважаныя рабіць заявы і даваць распараджэнні ад імя Асацыяцыі, па маёмасных і немаёмасных пытаннях.

2. Да паўнамоцтваў Старшыні Праўлення адносяцца:

1) арганізацыя працы Праўлення,

2) выкананне задач, вызначаных Рэгламентам Праўлення і Статутам,

3) скліканне пасяджэння Праўлення,

4) вызначае парадак дня на пасяджэнні Праўлення і вядзе пасяджэнні Праўлення, а ў выпадку сваёй адсутнасці на пасяджэнні, Старшыня Праўлення вызначае чальца Праўлення, які вядзе пасяджэнне замест Старшыні Праўлення.

§ 21.

1. Наглядальная рада з'яўляецца органам кантролю Асацыяцыі і складаецца з 3-5 чальцоў, якія выбіраюцца Агульным сходам сябраў.

2. Чальцы Наглядальнай рады могуць быць прызначаныя для выканання функцыі Старшыні або Намесніка старшыні Наглядальнай рады.

3. Тэрмін паўнамоцтваў Наглядальнай рады складае 6 гадоў і з'яўляецца агульным тэрмінам.

4. Да паўнамоцтваў Наглядальнай рады адносяцца:

1) прызначэнне і адкліканне чальцоў Праўлення, вызначэнне правілаў аплаты працы чальцоў Праўлення, заключэнне, змена і скасаванне кантрактаў з чальцамі Праўлення або прызначэнне даверанай асобы для такой дзейнасці,

2) зацверджанне справаздачаў чальцоў Праўлення,

3) кантроль за бягучай працай, гаспадарча-фінансавай дзейнасцю Асацыяцыі і выкананнем рашэнняў яе органаў,

4) зацвярджэнне перыядычных або гадавых фінансавых справаздач Асацыяцыі,

5) зацвярджэнне перыядычных або гадавых справаздач аб дзейнасці Асацыяцыі,

6) ініцыяванне склікання Агульнага сходу сябраў, скліканне Агульнага сходу сябраў, калі ён не быў скліканы Праўленнем у парадку, прадугледжаным дадзеным Статутам,

7) разгляд скаргаў Сябраў Асацыяцыі або Карпаратыўных сябраў на дзейнасць Праўлення,

8) выражэнне згоды на ўнясенне Праўленнем зменаў у дадзены Статут.

5. Наглядальная рада прымае рашэнні простай большасцю галасоў.

6. Чальцы Наглядальнай рады могуць удзельнічаць у пасяджэннях з дапамогай сродкаў дыстанцыйнай сувязі, якія забяспечваюць узаемную чутнасць для ўсіх асобаў, якія ўдзельнічаюць у пасяджэнні. Такі ўдзел з'яўляецца асабістай прысутнасцю на пасяджэнні. Пратакол аб прыняцці рашэння Наглядальнай рады ў такім рэжыме складаецца ў пісьмовай форме і падпісваецца Старшынём Наглядальнай рады, а ў выпадку яго адсутнасці – Намеснікам старшыні Наглядальнай рады.
7. Чальцы Наглядальнай рады могуць прымаць рашэнні шляхам абмену карэспандэнцыяй па пошце або кур'ерам, па факсе або электроннай пошце, калі ніводны чалец Наглядальнай рады не пярэчыць такой форме прыняцця рашэнняў. Пратакол аб прыняцці рашэння ў такім рэжыме складаецца ў пісьмовай форме і падпісваецца Старшынём Наглядальнай рады або Намеснікам старшыні Наглядальнай рады.

§ 22.

1. У выпадку скарачэння складу Наглядальнай рады Асацыяцыі на працягу тэрміну паўнамоцтваў яго склад можа быць дапоўнены шляхам кааптацыі.
2. Кааптацыя ажыццяўляецца іншымі чальцамі Наглядальнай рады шляхам прыняцця рашэння на працягу 30 дзён з дня скарачэння яго складу.
3. Чальцы Наглядальнай рады, прызначаныя шляхам кааптацыі, зацвярджаюцца Агульным сходам сябраў (дэлегатаў) на наступным сходзе.

## 5. КАЛЕГІЯЛЬНЫ СУД

§ 23.

1. Калегіяльны суд, далей – Суд, складаецца з 3-5 чальцоў, якія з'яўляюцца Сябрамі Асацыяцыі або былі вызначаныя Сябрамі Асацыяцыі. Чальцы суда не могуць быць чальцамі Праўлення. § 22 ужываецца адпаведна.
2. Да паўнамоцтваў Суда адносіцца разгляд справаў, якія датычаць:

   1) парушэння Сябрам Асацыяцыі сваіх абавязкаў, акрэсленых Статутам або іншымі ўнутранымі актамі, накіраванае ў Суд Праўленнем (па ўласнай ініцыятыве або пасля разгляду заявы Сябра Асацыяцыі або чальца органа Асацыяцыі), за выключэннем справаў, якія могуць прывесці да выключэння з Асацыяцыі, а таксама
   2) спрэчак паміж Сябрамі Асацыяцыі адносна іх дзейнасці ў Асацыяцыі.

3. Суд збіраецца па пісьмовай заяве Сябра Асацыяцыі і выносіць рашэнне на працягу не больш чым 30 дзён з дня падачы заявы. У выпадку ўзнікнення спрэчак паміж Сябрамі Асацыяцыі Суд загадзя вызначае тэрмін для прадстаўлення другім бокам спрэчкі пісьмовай пазіцыі.
4. Суд завяршае вытворчасць па справе вынясеннем рашэння, якім:

1) інфармуе ўсіх Сябраў Асацыяцыі – у пытаннях парушэння Сябрам Асацыяцыі сваіх абавязкаў, акрэсленых Статутам або іншымі ўнутранымі актамі,

2) інфармуе бакі – у выпадку ўзнікнення спрэчак паміж Сябрамі Асацыяцыі адносна іх дзейнасці ў Асацыяцыі.

5. Бакі ў спрэчцы могуць абскардзіць рашэнне Суда на наступным Агульным сходзе сябраў на працягу 30 дзён з даты паведамлення зацікаўленай асобы аб прынятым рашэнні. Зварот афармляецца пісьмова, шляхам падачы ў Офіс Асацыяцыі або накіравання на юрыдычны адрас Асацыяцыі.

6. Рашэнні Суда прымаюцца простай большасцю галасоў у прысутнасці не менш чым 50% фактычнага складу Суда.

7. Па справах аб парушэнні Сябрам Асацыяцыі сваіх абавязкаў, акрэсленых Статутам, Суд можа накласці наступныя спагнанні:

1) заўвагі,

2) вымовы,

3) прыпыненне ўсіх або некаторых правоў Сябра на тэрмін да 6 месяцаў.

8. У выпадку ўзнікнення спрэчак паміж Сябрамі Асацыяцыі Суд выносіць рашэнне аб вырашэнні спрэчкі або прызнае, што справа не можа быць разгледжаная Судом.

9. Суд прымае рэгламент Суду на першым пасяджэнні.

## 6. РЭГІЯНАЛЬНЫЯ АДДЗЕЛЫ

### § 24.

1. Асацыяцыя можа ствараць Рэгіянальныя аддзелы.

2. Рэгіянальныя аддзелы ствараюцца пастановай Праўлення Асацыяцыі.

3. Пастановаю Праўлення Асацыяцыі аб стварэнні Рэгіянальнага аддзелу вызначаюцца сфера дзейнасці, арганізацыя, правілы фінансавання і мэты дзейнасці аддзелу, у прыватнасці вызначаецца дырэктар аддзелу, яго кампетэнцыя і сфера адказнасці.

### § 25.

Асацыяцыя можа склікаць Гандлёвы суд або Арбітражны суд. Суд можа быць прызначаны пастановай Праўлення Асацыяцыі пасля атрымання пісьмовага заключэння Наглядальнай рады. Рэгламент Гандлёвага суда або Арбітражнага суда акрэсліваецца пастановай Праўлення аб прызначэнні Суда.

## 7. РУХОМАЯ І НЕРУХОМАЯ МАЁМАСЦЬ АСАЦЫЯЦЫІ

§ 26.

1. Да актываў Асацыяцыі належаць нерухомая, рухомая маёмасць, долі, правы, фінансавыя сродкі ды іншая маёмасць, атрыманая ад сяброўскіх унёскаў, спадчыны, ахвяраванняў і субсідыяў, даходаў ад маёмасці Асацыяцыі, даходаў ад гаспадарчай і статутнай дзейнасці і грамадскіх ахвяраванняў.
2. Прыняцце датацыяў, ахвяраванняў, завяшчанняў не можа залежаць ад умоваў, якія супярэчаць інтарэсам Асацыяцыі.
3. Маёмасцю і сродкамі Асацыяцыі распараджаецца Праўленне ў адпаведнасці з прынцыпамі, акрэсленымі гэтым Статутам.

## 8. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

§ 27.

1. Асацыяцыя можа быць распушчаная на падставе рашэння Агульнага сходу сябраў у парадку, вызначаным у § 16 ч. 5 і ў іншых выпадках, прадугледжаных законам.
2. Агульны сход сябраў, які прымае рашэнне аб ліквідацыі Асацыяцыі, вызначае парадак яе ліквідацыі і распараджаецца маёмасцю Асацыяцыі.
3. Ліквідацыйныя захады ажыццяўляюцца Ліквідацыйнай камісіяй, якая прызначаецца Агульным сходам сябраў. Ліквідацыйная камісія складае справаздачу аб праведзеных ліквідацыйных захадах і падае яе ў кампетэнтны суд.
4. У пытаннях, не прадугледжаных дадзеным Статутам, ужываюцца палажэнні Закона аб арганізацыях наймальнікаў і дзейнага заканадаўства.